## 2025 г. - 45 гадоў з часу заснавання Адкрытага акцыянернага таварыства «Ручайка» ў г. Кобрыне (1980), буйнога прадпрыемства па вытворчасці тканін тэхнічнага і бытавога прызначэння




Адкрытае акцыянернае таварыства «Ручайка» пачынала сваю дзейнасць як прадзільна-ткацкая фабрыка. Заснаваная ў 1980 годзе прадзільна-ткацкая фабрыка «Ручайка» забяспечвала Савецкі Саюз прадзівам, тэхнічнымі і дэкаратыўнымі тканінамі, з'яўлялася горадаўтваральным прадпрыемствам з колькасцю працуючых звыш трох тысяч. Фабрыка была адным з нешматлікіх прадпрыемстваў, арыентаваных на вытворчасць пражы з сумесі натуральных і хімічных валокнаў і тканін бытавога і тэхнічнага прызначэння.

Першая чарга будаўніцтва была ўведзена ў эксплуатацыю ў снежні 1980 года. Фабрыка складалася з дзвюх самастойных вытворчасцей: прадзення хімічных валокнаў і ткацкай. Цэхі былі аснашчаны тэхналагічным абсталяваннем машынабудаўнічых заводаў Пензы, Іванава, Кузнецка (Расія), Ташкента (Узбекістан), Германіі, Чэхіі, Італіі, Індыі.

Выпускалася адзіночная і кручаная пража як для ўласнага спажывання, так і таварная. Асабліва шырокі быў асартымент пражы трыкатажнага прызначэння ў розным сумесевым саставе з прымяненнем катанізаванага льновалакна. Асноўнымі пастаўшчыкамі сыравіны з’яўляліся Магілёўскае вытворчае аб’яднанне «Хімвалакно», прадпрыемствы Маскоўскай вобласці, Калінінграда, Разані (Расія). Бавоўнавае валакно імпартыравалася з рэспублік Сярэдняй Азіі. У 1997 годзе фабрыка працавала з новымі відамі валокнаў вытворчасці Германіі.

Крызісныя працэсы 1990-х гадоў, якія ўразілі ўсю эканоміку, наклалі адбітак і на працу маладога прадпрыемства. Знізіліся аб'ёмы вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, што пацягнула за сабой зніжэнне колькасці працуючых. Аднак дзякуючы прынятым мерам з боку органаў улады і кіраўніцтва прадпрыемства фабрыка была захавана, але пры гэтым значна зменшыліся яе вытворчыя плошчы. Востра паўстала пытанне мадэрнізацыі вытворчасці.

Ажыццявіць тэхнічнае пераўзбраенне фабрыкі дапамаглі тры інвестыцыйныя праекты. У рамках першага з іх у

2007 годзе было закуплена перадавое ткацкае і прадзільнае абсталяванне фірмы «SmitTextile» (Італія). У 2010 годзе, у ходзе рэалізацыі аднаго з важнейшых інавацыйных праектаў рэспубліканскага значэння, на прадпрыемстве было ўстаноўлена новае тэхналагічнае абсталяванне па вытворчасці тэхнічных тканін і тканін з полівінілхларыдным (ПВХ) пакрыццём. З таго часу «Ручайка» трансфармавалася з прадзільна-ткацкай фабрыкі ў адзінага ў Беларусі і аднаго з найбуйнейшых у краінах вытворца такіх матэрыялаў, як тканіны, прасякнутыя ПВХ-кампазіцыяй: тэнтавы матэрыял, матэрыялы для шахтавай вентыляцыі, дахавай мембраны, гідраізаляцыйныя матэрыялы.

З тканін, якія выпускаюцца прадпрыемствам, найбольшым попытам карыстаюцца тканіны суровыя з пражы ўласнай вытворчасці і хімічных ніцей. На аснове тэхнічных тканін шляхам нанясення полівінілхларыднай кампазіцыі вырабляюць матэрыялы для выкарыстання ў розных галінах народнай гаспадаркі: будаўніцтве, архітэктуры, машынабудаванні, сельскай гаспадарцы. З 2015 года ААТ «Ручайка» працуе прыбыткова, пастаянна павышаючы ўзровень дабаўленай вартасці на аднаго працуючага. Пасляхова асвоены выпуск інавацыйнага прадукту – сучаснага гідраізаляцыйнага дахавага матэрыяла з палімерным пакрыццём еўрапейскай якасці. Навінка актыўна выкарыстоўваецца пры ўладкаванні ці рамонце дахаў.

Пачынаючы з 2018 года, у рамках трэцяга інвестыцыйнага праекта, наладжана вытворчасць гатовых вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў з ПВХ кампазіцыямі, што дазволіла істотна пашырыць асартыментную лінейку гатовых тэнтавых і каркасна-тэнтавых вырабаў. Прадуктовы партфель ААТ «Ручайка» ўключае ў сябе: тэхнічныя і дэкаратыўныя тканіны, геатэкстыль, пражу, матэрыялы, прасякнутыя ПВХ кампазіцыяй і гатовыя вырабы з ПВХ тканін. Вобласць ужывання тканін ПВХ надзвычай шырокая і ўключае ў сябе выраб архітэктурных і каркасных збудаванняў, каркасна-тэнтавых канструкцый, ангараў, летніх кафэ, павільёнаў, складоў часовага захоўвання, ізаляцыйных чаш басейнаў, аўтатэнтаў, батутаў і інш. Спецыялісты прадпрыемства не спыняюцца, вывучаюць попыт на прадукцыю і працуюць над пашырэннем асартыментнай лінейкі.

Уласная лабараторыя стварае рэцэптуры ПВХ кампазіцый, якія дазваляюць вырабляць шырокі асартымент тэнтавых

матэрыялаў, адпаведных зададзеным крытэрам марозаўстойлівасці, пажарабяспекі, устойлівасці да кантакту з агрэсіўнымі рэчывамі. Высокі ўзровень арганізацыі вытворчасці, пацверджаны сертыфікатам адпаведнасці сістэмы менеджменту якасці СТБ ISO 9001-2015.

Вырабы ААТ «Ручайка» можна ўбачыць на многіх прадпрыемствах: складаны ангар на Баранавіцкім авіярамонтным заводзе, шэраг пнеўмакаркасных збудаванняў у Мінску і абласных цэнтрах, выпрабляліся складаныя вырабы для прадпрыемстваў «Раснафта» і «Беларуснафта». Матэрыял таварыства «Ручайка» выкарыстаны кітайскай кампаніяй для ўладкавання даху пры будаўніцтве высокатэхналагічнага аграпрамысловага комплексу ў Мінскай вобласці, Аршанскім ільнокамбінатам і «Магілёўхімвалакном» для рамонту сваіх дахаў. Прадпрыемствам выраблены палаткі для паграпкамітэта, распрацаваны і пастаўлены доследныя ўзоры вырабаў для Міністэрства абароны.

Сістэмны падыход у працы, эфектыўнае абсталяванне, высокакваліфікаваны персанал, багаты вопыт, веданне і разуменне кан'юнктуры рынку, узаемавыгадныя адносіны з партнёрамі дазваляюць прадпрыемству выпрабляць шырокі асартымент высакаякасных тэкстыльных і тэхнічных матэрыялаў, ствараць запатрабаваны рынкам прадукт.

Высокая якасць пацвярджаецца рознымі ўзнагародамі. ААТ «Ручайка» неаднаразова станавілася пераможцам Рэспубліканскага прафесійнага конкурсу «Лепшы будаўнічы прадукт года». У 2013 годзе, 2015 годзе па выніках заключэння экспертнага савета тэнтавы і дахавы матэрыял вытворчасці ААТ «Ручайка» сталі лаўрэатамі конкурсу ў намінацыі «Лепшы будаўнічы матэрыял (выраб) года». У 2021 годзе дахавы матэрыял вытворчасці ААТ стаў пераможцам XVIII Рэспубліканскага конкурсу «Лепшы будаўнічы прадукт года - 2021». У 2023 годзе прадпрыемства ААТ «Ручайка» прызнана пераможцам XXV Рэспубліканскага конкурсу спажывецкіх пераваг «Прадукт года — 2023».

ААТ «Ручайка» з'яўляецца буйнейшым у Рэспубліцы Беларусь прадпрыемствам лёгкай прамысловасці па вытворчасці тканін тэхнічнага і бытавога прызначэння. Гэта сучаснае прадпрыемства з багатай гісторыяй, згуртаваным калектывам і 45-гадовым вопытам у сферы вытворчасці высокатэхналагічнай прадукцыі, якое бесперапынна

развіваецца. Са жніўня 2024 года дырэктарам з’яляецца Сняжана Мікалаеўна Баранава.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі.

**Котяй, В. В**. Кобринская прядильно-ткацкая фабрика “Ручайка” / В. В. Котяй // Регионы Беларуси : энциклопедия: в 7 т. – Т. 1. Брестская область: в 2-х кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 465.

**Кобринская** прядильно-ткацкая фабрика // Лён : энциклопедия. – Минск, 2009. – С. 60,61 : фот.

**Рысь, А. М.** Рэспубліканскае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства “Кобрынская прадзільна-ткацкая фабрыка “Ручайка” / А. М. Рысь // Памяць. Кобрынскі раён: гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 410-411 : фат.

**Киселев, Т. Я.** Избранные статьи и выступления / Т. Я. Киселев. – Минск : Беларусь, 1984.

См. на с. 35, 157.

**Кобринская** прядильно-ткацкая фабрика // Белорусское Полесье: проблемы развития и размещения производительных сил. - Минск, 1983. – С. 102.

**Мы** строим Брестчину / [Н. В. Митюкова и др. ; редколлегия: С. Н. Лободинский и др. ; фото: В. В. Король, А. И. Шульгач]. - Брест : Брестская типография, 2019. - 367 с.

См. на с. 51 – упоминание о строительстве Кобринской прядильно-ткацкой фабрики.

**На** то нам юность дана. – Минск : Юнацтва, 1989. – 124 с.

См. на с. 91 - посланцы вузов и техникумов работали на строительстве Кобринской ПТФ.

**Сидор, С. И.** Белорусская ССР в одиннадцатой пятилетке / С. И. Сидор. – Минск, 1983. – 63 с.

См. на с. 31,61 - Кобринская прядильно-ткацкая фабрика.

**Адкрытаму** акцыянернаму таварыству «Ручайка» (1980) – 45 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і

інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 190.

**Бакун, Е.** У "Ручайки" новый руководитель / подготовила Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 17 жніўня (№ 33). — С. 5 : фот.

На должность директора ОАО "Ручайка" назначена Снежана Баранова.

**Бакун, Е.** Залог успеха: качество и современные технологии / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 10 чэрвеня (№ 42). — С. 1, 10 : фот.

О работе коллектива ОАО "Ручайка".

**Бакун, Е.** "Продукт года — 2023" от ОАО "Ручайка" / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун и из архива ОАО "Ручайка" // Кобрынскі веснік. - 2023. — 16 снежня (№ 72). — С. 5 : фот.

Предприятие ОАО "Ручайка" признано победителем XXV Республиканского конкурса потребительских предпочтений "Продукт года — 2023".

**Бакун, Е.** Шагать в ногу со временем / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2022. — 11 чэрвеня (№ 43). — С. 4 : фот.

О работе ОАО "Ручайка".

**Ярмошук, Н.** Легкая на подъем / Николай Ярмошук ; фото Павла Богуша, Алексея Бибикова // Рэспубліка. - 2022. — 31 мая (№ 99). — С. 1, 11 : фот.

О работе прядильно-ткацкой фабрики ОАО "Ручайка" г. Кобрина.

**Бакун, Е**. Кровельная мембрана от "Ручайки" — лучшая / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 13 лістапада (№ 90). — С. 4 : фот.

ОАО "Ручайка" стало победителем XVIII Республиканского конкурса "Лучший строительный продукт года — 2021".

**Баланович, И.** ОАО «Ручайка»: вчера, сегодня, завтра / Ирина Баланович ; [беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин информ. – 2021. – 1 апреля (№ 13). – С. 2.

О сегодняшних реалиях ОАО «Ручайка» журналист «К-И» беседует с директором предприятия Ириной Баланович.

**Елизарова, Ж.** «Ручайка» - значит качество / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 24 снежня (№ 99). – С. 1, 4.

30 декабря ОАО «Ручайка» отмечает 40-летний юбилей.

**Елизарова, Ж.** Будущее страны определяют инновации / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 13 чэрвеня (№ 45). — С. 1 : фот.

ОАО «Ручайка» — один из крупнейших в СНГ производителей баннерных и тентовых материалов, кровельной мембраны, материалов для шахтной вентиляции и гидроизоляции.

**Елизарова, Ж**. «Ручайка» - значит качество / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2020. – 24 снежня (№ 99). – С. 1, 4 : фот.

30 декабря ОАО «Ручайка» отмечает 40-летний юбилей.

**Литвинович, Е.** "Ручайка": давний бренд на новый лад / Евгений Литвинович // Заря. - 2017. — 28 февраля. — С. 5.

Кобринская прядильно-ткацкая фабрика "Ручайка" - это высокотехнологичное производство.

**Дубина, Л.** Ирина Григорьян: "Традиции качества - современные технологии" / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2016. - 11 чэрвеня. - С. 1, 3.

В канун профессионального праздника Дня работников легкой промышленности - беседа с директором ОАО "Кобринская прядильно-ткацкая фабрика "Ручайка".

**Мельнік, Р.** Анатолій Ліс: "Любую праблему можна вырашыць, калі мысліць творча" / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2015. – 3 чэрвеня. – С. 2.

Старшыня абласнога выканкама А. Ліс з рабочым візітам наведаў прадзільна-ткацкую фабрыку "Ручайка".

**Жук, Е**. А ну-ка, выРучайка! / Елена Жук // Вечерний Брест. – 2014. – 16 мая. – С. 4.

О проблемах прядильно-ткацкой фабрики.

**Девяткова, С**. В режиме перемен / Светлана Девяткова // Народная газета. – 2012. – 11 снежня. – С. 7.

Прядильно-ткацкая фабрика "Ручайка".

**Савчук, М.** "Ручайка" – так держать! / Маргарита Савчук, Жанна Елизарова // Кобрин-информ. – 2012. – 26 января. – С. 3.

"Ручайка" стала лауреатом в конкурсе "Лучшие товары Республики Беларусь" в 2011 году.

**Сергеев, И**. Экспорт растет / Иван Сергеев // Заря. – 2012. – 17 января. – С. 2.

Фабрика начала поставку продукции в Польшу.

**Блюдник, А**. Стратегия обновления / Алёна Блюдник // Кобрынскі веснік. – 2011. – 16 сакавіка. – С. 2.

ПТФ “Ручайка” работает над реализацией нового инвестиционного проекта.

**Веремеенко, С**. “Ручайка” – дипломанты международной выставки / Светлана Веремеенко // Кобрин – информ. – 2011. – 27 октября. – С. 5 ; Кобрынскі веснік. – 2011. – 29 кастрычніка. – С. 2.

Фабрика приняла участие в международной специальной выставке в Минске.

**Елизарова, Ж**. Курс на высокое качество / Жанна Елизарова // Кобрин-информ. – 2011. – 3 февраля. – С. 2.

На фабрике введена в эксплуатацию новая линия по производству текстильных материалов.

**Кобринской** прядильно-ткацкой фабрике «Ручайка» исполнилось 30 лет // Кобрин-информ. – 2011. – 6 января. – С. 2.

**Покрывала** от «Ручайки» // Кобрин-информ. – 2011. – 1 сентября. – С. 2.

На фабрике запущено производство нестандартных укрытий и автопокрывал.

**Шупілаў, М**. ПТФ “ручайка”: шляхам мадэрнізацыі // Мікалай Шупілаў; [гутарыў] Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2011. – 11 чэрвеня. – С. 1,2.

**Волков, С.** “Ручайка” модернизируется / Сергей Волков // Заря. – 2010. – 30 декабря. – С. 2.

**Васюк, Н**.”Ручайка” на пороге новой жизни / Наталья Васюк // Кобрин-информ. – 2009. – 25 июня. – С. 2.

**Квартальная. И**. “Крыша” от “Ручайки” / Ирина Квартальная // Заря. – 2009. – 20 июня. – С. 3.

Фабрика получила более 9 млн. евро для модернизации производственных тканей.

**Праекты** для “Ручайкі” // Народная трыбуна. – 2009. – 28 лістапада. – С. 3.

На прадпрыемстве завершана рэалізацыя інвестыцыйнага праекта “Тэхнічнае пераўзбраенне прадзільнай вытворчасці”.

«**Ручайка»** модернизируется // Заря. – 2009. – 12 декабря. – С. 4.

Фабрика налаживает производство технических тканей с ПВХ-покрытием.

**Максимчик, А**. Обнадеживающий импульс / Алексей Максимчик // Кобрынскі веснік. – 2007. – 9 чэрвеня. – С. 1-2.

О состоянии дел и перспективах развития «Ручайки».

**О предоставлении** гарантии Правительства РБ открытому акционерному обществу «Белагропромбанк» в погашении кредита, выданного ОАО «Кобринская прядильно-ткацкая фабрика «Ручайка» : постановление Совета Министров РБ от 31 августа 2006 г., № 1110 // Национальный реестр правовых актов. – 2006. - № 145. – 5/22831.

**Винярский, С**. Сотрудничество до Киева доведет / С. Винярский // Вечерний Брест. – 2003. – 12 ноября. – С. 3.

**Пянко, А**. С надеждой на лучшее / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2003. – 7 чэрвеня. – С. 2.

ПТФ «Ручайка».

**Пянко, А**. В центре внимания – «Ручайка» / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2002. – 30 кастрычніка. – С. 2.

**Кукса, М**. Радует товаром «Ручайка» / М.Кукса // Заря. – 1998. – 13 июня. – С. 2.

**Максімчык, А**. Наваселле магазіна / А.Максімчык // Кобрынскі веснік. – 1998. – 24 студз. – С. 2.

Магазін прадзільна- ткацкай фабрыкі.

**Максімчык, А**. Надзейная служба / А. Максімчык // Кобрынскі веснік. – 1998. – 21 студзеня. – С.1.

Пра майстра парасілавай гаспадаркі ПТФ С.К.Дзмітрэнка.

"**Ручайка"** работает на заказ // Кобрынскі веснік. – 1998. – 8 лютага. – С. 3.

**Хільчук, М**. Прадпрыемства стала прыбытковым / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1996. – 20 лістапада. – С. 1.

**Кукса, М**. Свет и тени второй недели / М. Кукса // Заря. – 1990. – 19 мая. – С. 2.

Работа ПТФ в условиях реформы.

**Пятроўская, М**. Добры старт / Марыя Пятроўская // Камуністычная праца. – 1989. – 6 чэрвеня.

Прадзільна-ткацкая фабрыка.

**Славін, Б**. Майстэрства і натхненне / Б. Славін // Камуністычная праца. – 1987. – 11 жніўня.

Прадзільна-ткацкая фабрыка.

**Бялова, Н**. Час станаўлення - час перамог / Надзея Бялова // Камуністычная праца. – 1985. – 9 ліпеня.

Прадзільна-ткацкая фабрыка.

**Кукса, М**. Мастерство трудом куется / М. Кукса // Заря. – 1985. – 14 февраля. – С. 2.

Прядильно-ткацкая фабрика.

**Якубовіч, Г**. Праверка на сталасць / Г. Якубовіч // Камуністычная праца. – 1985. – 22 студзеня.

Эканамічны эксперымент на Кобрынскай ПТФ.

**Ліпай, П**. І тчэцца палатна сувой… : фотарэпартаж з Кобрынскай прадзільна-ткацкай фабрыкі / П. Ліпай // Беларусь. – 1984. - № 6. – С. 8-9.

**Правафланговыя** спаборніцтва // Звязда. – 1984. – 27 ліпеня.

Пра ткачыху Валянціну Клец.

**Сусиков, П**. Новоселье раньше срока / П. Сусиков // Советская Белоруссия. – 1984. – 19 октября.

Завершено строительство ткацкого производства ПТФ.

**Кобрынскі шоўк** // Звязда. – 1983. – 14 студзеня ; Заря. – 1983 – 14 января.

Уведзена ў строй першая чарга ткацкай вытворчасці Кобрынскай ПТФ.

**Рабочий настрой** // Советская Белоруссия. – 1983. – 27 мая.

Освоение новых мощностей на ПТФ.

**Перед пуском** // Промышленность Белоруссии. – 1981. - № 1. – С. 49.

Прядильно-ткацкая фабрика.

**Шостак, Д**. Побежала шелковая нить // Д. Шостак // Заря. – 1981. – 14 января.

**Воранаў, Г**. Якой будзе фабрыка / Г. Воранаў // Камуністычная праца. – 1980. – 3 ліпеня.

*Рэгіён:*

Кобрынскі раён

Кобрын

*Установы:*

Кобрынская прадзільна-ткацкая фабрыка

«Ручайка» ААТ

*Прадметы*:

Фабрыкі